Сьветлай памяці Зоры КІПЕЛЬ
прысьвячаецца

АД УКЛАДАЛЬНІКА

У Пасланьні Сьвятога апостала Паўла да Эфэсянаў прамоўлены наступныя словы, скарыстаныя ў назове гэтага зборніку:

«Умольваю вас я, вязень у Госпадзе, каб вы хадзілі дастойна пакліканьня, якім пакліканыя, з усёй пакорлівасьцю і лагоднасьцю, з доўгацярплівасьцю і любоўю адны адных пераносячы, імкнучыся захаваць адзінства духа ў саюзе супакою. Адно цела й адзіны Дух, як пакліканыя вы ў адной надзеі пакліканьня вашага. Адзін Госпад, адна вера, адзін хрост. Адзін Бог і Айцец усіх, які над усімі, і праз усіх, і ва ўсіх нас» (Эф., 4, 1-6).

Адзін Госпад, адзін Спадар — для праваслаўных, каталікаў, уніятаў. Адзін — для беларусаў у Беларусі й па-за яе межамі. Гэтае адзінства — у Богу й веры — і ёсьць зьместам і ідэяй прапануемай кнігі.

У першым разьдзеле, «Хрыстовым шляхам», аўтары беларускага замежжа — сьвятары й навукоўцы — ва ўспамінах, нарысах-партрэтах і навукова-публіцыстычных артыкулах распавядаюць пра цярністыя шляхі Рыма-каталіцкай царквы на Беларусі, Беларускай каталіцкай (усходняга абраду) й Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай цэркваў ды лёсы іх зямных апосталаў.

Другі разьдзел, бібліяграфічны, зьмяшчае артыкулы з буйнейшых эміграцыйных газэтаў «Бацькаўшчына» й «Беларус», якія датычаць рэлігійнага жыцьця ў Беларусі й на выгнаньні.

У апошнім, трэцім, разьдзеле надрукаваны мастацкі нарыс Уладзімера Глыбіннага «На Сьвятой зямлі» пра ягонае падарожжа ў Ерусалім у 1966 г.

Спадзяемся, што гэтая публікацыя спрычыніцца да ўшанаваньня памяці людзей — сьвецкіх і сьвятароў, — якія прысьвяцілі сваё жыцьцё пашырэньню Божага Слова сярод беларусаў, і да ўмацаваньня ідэі царкоўнае й нацыянальнае еднасьці беларускага народу, еднасьці ў разнастайнасьці, што ёсьць падставай да дыялёгу паміж беларусамі розных канфэсій у духу ўзаемнае павагі і любові.